Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт
культуры і мастацтваў»

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Першы прарэктар БДУКМ
______________ А. А. Корбут
«_____»_____________2017 г.
Рэгістрацыйны № ВД-___ /вуч.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ГІСТОРЫЯ ДЭКАРАТЫЎНА-ПРЫКЛАДНОГА МАСТАЦТВА

*Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі*
*па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці*
*1-15 02 01 Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва (па напрамках),*
*напрамку спецыяльнасці 1-15 02 01-07 Дэкаратыўна-прыкладное*
*мастацтва (рэстаўрацыя вырабаў)*

2017

Вучэбная праграма складзена на падставе адукацыйнага стандарту вышэйшай адукацыі ОСВО 1-15 02 01-2013 па спецыяльнасці 1-15 02 01 Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва (па напрамках), вучэбнага плана ўстановы вышэйшай адукацыі па напрамку спецыяльнасці 1-15 02 01-07 Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва (рэстаўрацыя вырабаў), рэгістрацыйны № С 15-1-18/13 вуч. 27.06.2013 г.

**СКЛАДАЛЬНІК**

*Л. У. Дамнянкова,* дацэнт кафедры народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат гістарычных навук, дацэнт

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**

*Б. А. Лазука,* загадчык аддзела старажытнабеларускай культуры дзяржаўнай навуковай установы «Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі», кандыдат мастацтвазнаўства, дацэнт;

*В. В. Калацэй,* загадчык кафедры этналогіі і фальклору ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат культуралогіі, дацэнт

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**

*кафедрай* народнага дэкаратыўна-прыкладного мастацтва ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 7 ад 23.02.2016 г.);

*навукова-метадычным* саветам установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 1 ад 19.10.2016 г.)

Адказны за рэдакцыю: В. Б. Кудласевіч
Адказны за выпуск: Л. У. Дамнянкова

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбная дысцыпліна «Гісторыя дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва» – адзін з кампанентаў прафесійнай падрыхтоўкі студэнтаў спецыяльнасці «дэкаратыўна-прыкладное мастацтва». Узнікненне і асаблівасці развіцця дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва на розных этапах існавання цывілізацыі, сувязь з дзейнасцю чалавека, узроўнем развіцця тэхналогіі і майстэрства, прынцыпы формаўтварэння, разнастайнасць матэрыялаў і тэхнік іх апрацоўкі – гэтыя і іншыя пытанні разглядаюцца ў межах вучэбнай дысцыпліны.

Выкладанне вучэбнай дысцыпліны «Гісторыя дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва» арганічна звязана з выкладаннем спецыяльных дысцыплін «Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва», «Жывапіс», «Малюнак», «Колеразнаўства», «Матэрыялазнаўства». Праграма разлічана на засваенне студэнтамі матэрыялу па гістарычным і мастацка-вобразным развіцці твораў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Яна ўключае матэрыял па асноўных відах дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва ад старажытнасці да пачатку XX ст., ахоплівае найбольш значныя перыяды развіцця еўрапейскай культуры і па сваёй структуры адпавядае перыядызацыі, якая склалася ў мастацтвазнаўчай практыцы.

*Мэтай* вучэбнай дысцыпліны «Гісторыя дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва» з'яўляецца фарміраванне ў студэнтаў сістэмы тэарэтычных ведаў, якія будуць узбагачаць іх творчае мысленне і здольнасці да самаадукацыі, накіроўваць на вырашэнне прафесійных задач.

*Задачы* вучэбнай дысцыпліны:

– разгледзець асноўныя палажэнні тэорыі дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва;

– раскрыць спецыфіку развіцця дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва ад часоў старажытных цывілізацый да пачатку XX ст.;

– пазнаёміць са стылістычнымі асаблівасцямі еўрапейскага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва;

– даць асновы ведаў аб гісторыі дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, асноўных перыядах яго развіцця на беларускіх землях;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– вызначыць месца дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва ў духоўнай культуры беларусаў на розных этапах;

– сфарміраваць устойлівы інтарэс да гісторыі развіцця беларускага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, ацэньваць яго як крыніцу творчай дзейнасці мастака.

Засваенне праграмы павінна забяспечыць фарміраванне наступных груп кампетэнцый.

*Акадэмічныя кампетэнцыі*:

АК–1. Умець прымяняць базавыя навукова-тэарэтычныя веды ў галіне мастацкіх, навукова-тэхнічных, грамадскіх, гуманітарных, эканамічных дысцыплін і прымяняць іх для рашэння тэарэтычных і практычных задач прафесійнай дзейнасці.

АК–2. Валодаць сістэмным і параўнальным аналізам.

АК–11. Валодаць метадычнымі ведамі і даследчыцкімі ўменнямі, якія забяспечваюць вырашэнне задач інфармацыйна-метадычнай і навуковай дзейнасці.

*Сацыяльна-асобасныя кампетэнцыі*:

САК–1. Валодаць сфарміраванай грамадзянскай свядомасцю.

САК–7. Быць здольным усвядомлена ўспрымаць і беражліва ставіцца да гістарычнай, культурнай спадчыны Беларусі і свету, культурных традыцый і рэлігійных перакананняў.

*Прафесійныя кампетэнцыі*:

ПК–2. Адаптавацца да змянення віду прафесійнай дзейнасці ў межах кірунку спецыяльнасці.

ПК–6. Ствараць мастацкія творы ў галіне выяўленчага і народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва.

У выніку засваення вучэбнай дысцыпліны студэнты павінны *ведаць*:

– ролю і месца дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва ў сістэме пластычных мастацтваў;

– гістарычныя і нацыянальныя асаблівасці развіцця дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва з часоў старажытных цывілізацый да XX ст.;

– стылістычныя асаблівасці еўрапейскага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва;

– ролю і месца беларускага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва ў еўрапейскім мастацкім працэсе;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*умець*:
– вызначаць стылістычныя асаблівасці твораў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва;
– арыентавацца ў асаблівасцях гістарычнага і мастацкага працэсу мінулага і сучаснасці;
– выкарыстоўваць веды гісторыі і тэорыі ў працэсе стварэння твораў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва;
*валодаць*:
– метадамі аналізу стылістычных асаблівасцей дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва;
– метадамі комплекснага аналізу гістарычных і нацыянальных асаблівасцей твораў розных відаў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва;
– прынцыпамі вызначэння і параўнання асаблівасцей аўтарскіх стыляў твораў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва;
– навыкамі прымянення тэарэтычных ведаў развіцця дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва пры стварэнні твораў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва.

Да найбольш эфектыўных тэхналогій і метадаў навучання студэнтаў па вучэбнай дысцыпліне «Гісторыя дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва» належаць: тэхналогіі вучэбна-даследчыцкай дзейнасці, рэпрадукцыйныя метады (лекцыя, тлумачэнне, дыскусія, дэманстрацыя відэа- і аўдыязапісаў), метады самастойнай работы студэнтаў і кантрольна-ацэначныя метады.

Важнай часткай навучальнага працэсу з'яўляецца самастойная работа студэнтаў, якая складаецца са збору ілюстратыўнага і дадатковага матэрыялу па разглядаемых тэмах, вывучэння асобных тэм і раздзелаў дысцыпліны з выкарыстаннем метадычных рэкамендацый і літаратуры, рэкамендаванай выкладчыкам. Праграма змяшчае спіс асноўнай і дадатковай літаратуры, што абумоўлена адсутнасцю абагульняючых прац па дэкаратыўна-прыкладным мастацтве.

Праграма вучэбнай дысцыпліны «Гісторыя дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва» разлічана на 66 аўдыторных гадзін: лекцый – 22, практычных – 18, семінарскіх – 12 гадзін. Форма атэстацыі па вучэбнай дысцыпліне – экзамен.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

### *Уводзіны*

Дэкаратыўнае мастацтва – самая ранняя форма культуры. Адметныя рысы: адлюстраванне ўяўленняў аб структуры і арганізацыі свету, высокая змястоўнасць вобразаў, эстэтыка матэрыялаў, рацыянальнасць форм. Асаблівасці развіцця дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, абумоўленасць узроўнем матэрыяльнай культуры (тэхналогіі), бытавым укладам, класавымі, этнічнымі і сацыяльнымі фактарамі.

Роль дэкору ў мастацкім вырашэнні твора дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Узнікненне арнаменту. Універсальныя геаметрычныя матывы і сімвалы (круг, крыж, квадрат, свастыка, спіраль, канцэнтрычныя кругі, хваля, меандр, пляцёнка, валюта), сусветнае дрэва – вобраз пабудовы свету; універсальныя кампазіцыі (лінейная, шахматная, кругавая). Віды арнаментаў; арнамент – адлюстраванне часу, гісторыка-мастацкіх стыляў.

Відавая структура дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Паняцце аб стылістыцы мастацтва. Асноўныя стылявыя эпохі, мастацкія школы. Класіфікацыя відаў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва па практычным прызначэнні, матэрыяле, тэхніцы выканання. Кампазіцыя і выразныя сродкі ў дэкаратыўна-прыкладным мастацтве. Пабудова формы вырабу і яе сувязь з прызначэннем, канструктыўнымі і пластычнымі магчымасцямі матэрыялаў.

Асноўныя крыніцы па вывучэнні дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва.

### Раздзел 1. Станаўленне дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва

#### *Тэма 1. Неалетычнае дэкаратыўна-прыкладное мастацтва*

Характэрныя рысы дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва неаліту: поліфункцыянальнасць, яскрава выяўленая мэтазгоднасць, высокая мера ўстойлівасці і ўмоўнасці, сінкрэтызм, рэгіянальная, этнічная і стылістычная разнастайнасць, наяўнасць універсальных рыс. Выразныя прыклады неалетычнага мастацтва: культуры Трыполля, дадынастычнага Егіпта, Чатал-Хююка, Яншао і Луншань.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Шырокае распаўсюджванне мелкай пластыкі (статуэткі, пячаткі-ўпрыгажэнні) з каменю, косці, рога, гліны; абагуленасць трактоўкі, схематызм, ясная архітэктоніка, дамінаванне зааморфных выяў.

Керамічны посуд, характар формаўтварэння і дэкарыравання; агульныя і спецыфічныя рысы.

*Тэма 2. Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва старажытных цывілізацый*

Асаблівасці развіцця дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва старажытных цывілізацый. Разнастайнасць відаў, шырата выкарыстоўваемых матэрыялаў, тэхналагічныя адкрыцці, высокі ўзровень майстэрства.

*Кераміка.* Гліняны посуд, тэхнікі вырабу: лепка, фармаванне на ганчарным крузе, паліроўка, абпал. Разнастайнасць форм, характар дэкору. Вырабы з фаянсу – адно з дасягненняў мастацкіх рамёстваў Егіпта (фаянсавыя пліткі, канопы, пацеркі, посуд). Пярэдняя Азія: дэкаратыўная мазаіка храма Багіні Іштар.

*Шкло.* Асаблівасці тэхналогіі: апрацоўка на стадыі вязкага цеста, непразрыстасць шкла, формаўтварэнне – тэхніка стрыжня, мазаічная; разнастайнасць асартыменту, паліхромнасць вырабаў, малюнак «пёр’я».

*Мастацкая апрацоўка металу* – развітыя рамёствы Старажытнага Егіпта і Пярэдняй Азіі, Кітая; матэрыялы, тэхнікі (чаканка, ліццё, пайка, насечка, гравіраванне, цісненне, траўленне, зернь, інкрустацыя); разнастайнасць асартыменту ювелірных вырабаў: упрыгожанні, посуд, рытуальныя рэчы. Апрацоўка медзі і бронзы; пашыраныя тэхналогіі вытворчасці: ліццё са стратай воскавай мадэлі, састаўныя формы; дапаўненне гравіроўкай, інкрустацыяй. Вырабы: дэкаратыўныя накладкі, посуд, жароўні, люстэркі, скульптурная пластыка. Асаблівасці кітайскіх, лурыстанскіх і скіфскіх вырабаў, «звярыны стыль».

*Мэбля.* Разнастайнасць мэблі: крэсла, табурэты, ложкі, складныя крэслы і ложкі; матэрыялы (эбенавае дрэва, акацыя, кедр, кіпарыс і інш.); канструктыўныя і дэкаратыўныя асаблівасці (фанераванне; завяршэнне ножак у форме галавы качкі, капыта, львінай лапы; багацце аздаблення). Выраб прадметаў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

туалету: грабяні, лыжачкі для касметычных мэт, футаралы для люстэркаў.

*Тэкстыль.* Вытворчасць тканін з ільну, воўны; якасныя паказчыкі, асаблівасці аздаблення; прызначэнне. Знаходкі самых старажытных тэкстыльных вырабаў (Пазырыкскія курганы): тканіны, прадметы з лямцу, футра, скуры; пазырыкскі ворсавы дыван: высокая мастацкая каштоўнасць: арыгінальнасць кампазіцыі, паліхромнасць, яркасць і каларыстычнае багацце, высокі тэхналагічны ўзровень, сімвалізм матываў.

### *Тэма 3. Развіццё дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва антычнасці*

Асаблівасці развіцця дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва антычнасці. Цесная сувязь з характарам развіцця вытворчасці, светапогляднымі канцэпцыямі, рэлігійнымі вераванннямі. Культуры эгейская, Грэцыі, этрускаў і Рыма, час пашырэння і арэалы; найбольш развітыя віды мастацкага рамяства.

*Кераміка.* Крыта-мікенская кераміка стылю «камарэс» («кікладская жароўня», «Ваза з Гурніі»). Грэцыя: перыяды развіцця керамікі і стылі: геаметрычны, арыенталізуючы (дывановы); чорнафігурны, чырвонафігурны, белафонны роспіс. Разнастайнасць форм і прызначэння керамічных вырабаў; роспіс: сюжэты, майстры. Этруская кераміка «імпасто» і «букеро», посуд складаных форм падобны на жывёлу, птушак, расліны. Канопы, іх прызначэнне і дэкор.

*Шкло.* Характар развіцця вытворчасці: прадаўжэнне егіпецкіх традыцый, выкарыстанне шкловыдзімальнай трубкі; прыёмы формаўтварэння, тэхнікі аздаблення: гравіроўка, роспіс, двухслойнае і залачонае шкло, разнастайнасць асартыменту і форм. Высокі ўзровень рымскага шкла.

*Мастацкая апрацоўка металаў.* Крыта-мікенскія ювелірныя вырабы (залатыя маскі, посуд, статуэткі). Высокі ўзровень рамяства Старажытнай Грэцыі, разнастайнасць матэрыялаў, тэхнік, ювелірныя вырабы (посуд, пакрытыя чаканым ліставым золатам статуі, упрыгажэнні, дэкаратыўныя пласцінкі і інш.); бронзавыя люстэркі. Асаблівасці развіцця этрускага ювелірнага рамяства: валоданне коўкай, чаканкай, гравіроўкай і асабліва тэхнікай зерні і філіграні; вырабы: залатыя фібулы, каралі, падвескі, разнастайны посуд.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Мэбля.* Матэрыялы для вырабу мэблі (дрэва, метал, камень), вынаходніцва тэхналогіі гнуцця драўніны; прадаўжэнне ўсходніх традыцый, шырокае ўжыванне ложкаў, разнастайнасць сталоў: на адной, трох, чатырох ножках, своеасаблівасць іх формы; крэслы, іх прызначэнне; разнастайнасць мэблі для захоўвання: куфры, шафы, вітрыны.

### *Тэма 4. Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва Старажытнага Усходу*

Спецыфіка развіцця дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва Старажытнага Усходу.

*Кераміка.* Гісторыя развіцця кітайскага фарфору; час з'яўлення протафарфору (II–IV стст.); высокі ўзровень тэхналогіі і майстэрства кітайскіх керамістаў. Разнастайнасць керамічнай вытворчасці перыяду Тан і Сун (VII– XIII стст.); у формаўтварэнні капіраванне сасанідскіх сярэбраных сасудаў, эліністычных амфар; недастатковасць белізны і прасвечвання, ужыванне селадонавай палівы, папулярнасць манахромных вырабаў; асартымент; аздабленне высокім рэльефам, скульптурнымі выявамі, гравіроўкай; першыя вырабы з белага фарфору з яркім трохколерным («сань-цай») роспісам.

XIV–XV стст. – экспарт у Еўропу ранняй кітайскай керамікі: селадоны і кобальты (сіне-белы фарфор). Моцны ўплыў кітайскага фарфору на развіццё еўрапейскай керамікі.

Перыяд Мін (XIV–XVII стст.) – вытворчасць белага празрыстага фарфору; трохколерны і пяціколерны («у-цай»), манахромны роспіс; шырокі асартымент вырабаў. Вяршыня майстэрства керамістаў перыяду Цын; вытворчасць сініх вырабаў на кобальтавай аснове, аднатонных (фіялетавых, агурковазялёных, ахрыста-жоўтых), паліхромных («ружовае сямейства», «зялёнае сямейства», «чорнае сямейства»). Раслінныя і сюжэтныя кампазіцыі з уключэннем сімвалічных матываў. Паступовы заняпад керамічнага мастацтва, імітацыя металу, каменю, лаку; вычварнасць форм, вырашэнне складаных тэхнічных задач.

*Мастацкі тэкстыль Усходу.* Віды: дываны, паясы, тканіны.

Персідскія дываны, росквіт мастацтва пры дынастыі Сефевідаў (XVI–XVII стст.). Асаблівасці кампазіцыйнай пабудовы дывана – метафара райскага саду, статычнасць кампазіцыі,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сімвалізм колеру, абстрактны ці раслінны дэкор; асабістыя прынцыпы арнаментацыі пэўных майстэрань, гарадоў. Вядомыя цэнтры вытворчасці дываноў: Тэбрыз, Ісфахан, Герат, Шыраз, Кашан. Каўказскія ворсавыя дываны і кілімы; адметнасць армянскіх дываноў – уключэнне стылізаваных выяў людзей і жывёлы.

Дываны з лямцу – вынаходніцтва качэўнікаў еўразійскіх стэпаў, асаблівасці тэхналогіі, характар арнаментальнай базы: жывёльны і раслінны свет, сімвалічнае значэнне матываў і колеру.

Кітайскі шоўк, вытворчасць з III тыс. да н. э.; археалагічныя знаходкі. Разнастайнасць тэхнік ткацтва і асартыменту (дываны-«кэсы», тканіны); аднатонныя і ўзорыстыя тканіны; арнамент: перакрыжаваныя ромбы, стылізаваныя аблокі, жывёлы, фантастычныя выявы, раслінныя матывы; аздабленне тканін вышыўкай, батыкавай тэхнікай; шматколернасць, насычанасць і яркасць каларыту. Вялікі шоўкавы шлях, яго значэнне ў распаўсюджанні шоўкаткацтва.

*Разьба па камені, дрэве, косці* – адзін са старажытнейшых відаў прыкладнога мастацтва Кітая. Высокі ўзровень майстэрства, сімвалічны сэнс вырабаў; разнастайнасць матэрыялаў (нефрыт, какосавы арэх, бамбук, рог, бурштын і інш.). Вырабы з нефрыту: рытуальныя нефрытавыя прадметы (статуэткі, дыскі «бі», правугольныя блокі «цзун»); пячаткі, упрыгожанні (амулеты, паясныя спражкі, падвескі, знакі адрознення), аздабленне частак зброі (рукаяці мячоў), дэкаратыўныя вазы.

Традыцыйнасць мастацтва разьбы па косці, шырокі асартымент вырабаў (веееры, заколкі для валасоў, палачкі для ежы, чашы і інш.), гуанджоўскія «шар у шары» (першыя вырабы з эпохі Сун –1279 гг.).

Разьба па дрэве – самы распаўсюджаны від кітайскага прыкладнога мастацтва; разнастайнасць парод драўніны (камфарнае дрэва, тополь, самшыт, сандал, груша, бамбук і інш.) і прадметаў побыту і ўпрыгожанняў; сюжэтныя кампазіцыі, маскі, раслінны свет; Донг'янг – вядучая ш
ве, асаблівасці: натуральная прыгажосць матэрыялу, сюжэтная, шматузроўневая, скульптурна-рэльефная разьба, час нараджэння (дынастыя Тан).

Нэцке – японскія і кітайскія мініяцюрныя вырабы (3–4 см) з косці, дрэва, фарфору, металу, нефрыту, бурштыну і інш.; час з’яўлення (другая палова XVI – пачатак XVII ст.); практычная і сімвалічная функцыі; тыпы нэцке: трохмерныя выявы людзей, жывёл я; найбольш распаўсюджаны японскіх тэатраў; круглыя, падобныя на гузік ці сасуд, з сакрэтам.

## Раздзел 2. Еўрапейскае дэкаратыўна-прыкладное мастацтва

### *Тэма 1. Асаблівасці развіцця еўрапейскага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва Сярэднявякоўя*

Агульная характарыстыка развіцця еўрапейскага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва Сярэднявякоўя. Паступовае развіццё мастацкіх рамёстваў, канцэнтрацыя вытворчасці пры манастырах, значная роля царквы; з’яўленне першых цэхавых арганізацый; узаемадзеянне разнастайных відаў мастацтва, уплыў архітэктуры на развіццё дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва.

Крыжовыя паходы – моцны штуршок для развіцця мастацкіх рамёстваў. Канцэнтрацыя культурнага жыцця ў гарадах, з’яўленне новых відаў пабудоў. Змены ў характары жылля і аздабленні інтэр’ераў. Паступовы адыход ад прынцыпаў раманскай стылістыкі, з’яўленне новых тэхналогій (вынаходніцтва лесапільні); пашырэнне сфер мастацкага рамяства.

Праявы гатычнага стылю ў дэкаратыўна-прыкладным мастацтве, фарміраванне нацыянальных школ.

*Мэбля.* Прымітыўны характар еўрапейскай сярэдневяковай мэблі – куфар як яе асноўны від, многафункцыянальнасць. Культавая мэбля: літургічныя лавы, кафедры, рызнічныя шафы, крэслы з пюпітрам. Свецкая мэбля: сталы, ложкі (наяўнасць стрэшкі і полага); ужыванне грунтоўкі і роспісу, дэкаратыўных металічных накладак, радоў цвікоў. Ужыванне раслінных матываў (стылізаваныя лісці, гронкі, галінкі, матывы с фігуркамі людзей і жывёл, фантастычных істот, геаметрычныя матывы: пляцёнкі, меандры, зігзагі); адсутнасць арганічных суадносін паміж формай і дэкорам, уплыў архітэктурнага дэкору.

Царкоўнае паходжанне раннегатычнай мэблі, распаўсюджанне рамачна-філёнчатай канструкцыі, паступовы адыход



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

мэблі ад сцен; асноўны від мэблі – куфар, паступовае пашырэнне канструктыўных вырашэнняў, ператварэнне куфра ў іншыя тыпы мэблі: шафы для посуду, крэслы са спінкамі і падлакотнікамі; развіццё канструкцый крэслаў і сталоў. Шырокае ўжыванне ў аздабленні разьбы («ільняныя складкі»), архітэктурных элементаў (спічастых скляпенняў, ніш, ажурных арнаментаў), роспісу, металічных аковак; матывы: геаметрычныя (уплыў ісламу), раслінныя (вінаградныя лісці і гронкі, гірлянды, завіткі, разеткі, кветкі), шчыты і картушы; нязначная перанасычанасць кампазіцый.

*Еўрапейская кераміка:* кафля для падлогі, тэхналогія вырабу, выкарыстанне палівы; формы (квадратныя, прамакутныя і шасцікутныя), дэкор (раслінны, жывёльны, тэраталагічны), асаблівасці ўкладкі. Вытворчасць ганчарнага посуду, сціпласць дэкору. З'яўленне меца-маёлікі ў Італіі, ужыванне роспісу пад палівай, сграфіта, іспана-маўрытанскія матывы ў дэкоры.

*Шкло.* Дамінаванне вітражнага шкла ў раманскі і гатычны перыяды. Характар развіцця вытворчасці посуду: невялікія вырабы літургічнага і аптэкарскага прызначэння, колеравае шкло; паступовае пашырэнне вытворчасці посуду, асартымент: бутлі, кубкі, шкляніцы; тэндэнцыя да вырабу бясколернага шкла.

Пачатак вытворчасці венецыянскага шкла, арыентацыя на ўсходнюю тэхналогію; шырокі асартымент вырабаў, распрацоўка тэхналогіі празрыстага (крышталю), малочнага (лаціма), колеравага шкла, роспіс эмалямі.

*Ювелірнае мастацтва.* Візантыйскія ювелірныя вырабы: залатыя энкалпіёны і культавы посуд, тэхнікі іх вырабу; эмалі, колеравая палітра, асаблівасці тэхналогіі.

Заходнееўрапейскі мастацкі метал. «Звярыны стыль» і яго вытокі. Металапластыка: тэхнікі (насечка, перагародчатая эмаль, філігрань); асартымент (фібулы, паясныя бляхі, зброя, ватыўныя кароны).

Мастацкі метал раманскага і гатычнага перыядаў. Каваныя вырабы: накладкі, рашоткі, агароджы; дзвярныя малаткі, царкоўныя люстры і кандэлябры, купелі, культавы посуд з бронзы.

Ювелірнае мастацтва: футаралы для званоў, куфэркі і рэлікварыі, культавы і свецкі посуд.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Уплыў архітэктуры і скульптуры на развіццё ювелірнага мастацтва готыкі, спалучэнне ў адным вырабе разнастайнай ювелірнай тэхнікі, фактур і дэкору. Эмальернае мастацтва Германіі і Францыі (ліможскія эмалі) – рэлікварыі разнастайныя па формах, кніжныя аклады, крыжы, медальёны; з’яўленне празрыстых перагародчатых эмаляў. Новы від свецкага посуду ад нямецкіх ювеліраў – кубак з на
выя і свецкія вырабы.

*Мастацкія тканіны.* Копцкія тканіны: сыравіна, тэхнікі (палатнянае ткацтва, габеленавая тэхніка, вышыўка, набіванка), вырабы (адзенне, посцілкі, завесы), асаблівасці арнаментацыі тканін: сюжэтныя матывы міфалагічнага і хрысціянскага характару, выявы расліннага, жывёльнага, фантастычнага свету, сцэны паўсядзённага жыцця; насычаная і разнастайная колеравая палітра.

Развіццё візантыйскага мастацкага ткацтва, уплывы антычныя, усходнія; выраб шаўковых тканін, дываноў; разнастайнасць фактур, ужыванне металічных нітак, вышыўкі; раслінныя, геаметрычныя, тэраталагічныя і хрысціянскія матывы, іх сімвалічная функцыя; дробнарапортныя і буйнарапортныя кампазіцыі, шырокая колеравая палітра.

Дыван з Баё (дыван каралевы Мацільды) – прыклад мастацкай вышыўкі раманскага часу; сюжэтная аснова і кампазіцыйная пабудова; тэхнікі, колеравая палітра.

XI ст. – пачатак вытворчасці шпалер у Заходняй Еўропе, уплыў кніжнай мініяцюры на кампазіцыйную пабудову, шпалеры серыі «Дванаццаць месяцаў».

Асаблівасці развіцця гатычных шпалер: манументальнасць, дэкаратыўнасць, уплыў кніжнай мініяцюры; рэлігійная тэматыка, паступовае пашырэнне палітры і тэм, набліжэнне да жывапісу. Цэнтры шпалернай вытворчасці: Арас, Турнэ, Бруге, Брусель.

Іспанскія і італьянскія мастацкія тканіны, уплывы мусульманскія, візантыйскія, кітайскія; разнастайнасць тканін (бархат, парча, тафта, узорысты шоўк); стылістычныя змены, іх праявы ў арнаментальнай базе, трактоўцы матываў.

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

*Тэма 2. Рэнесансныя і барочныя рысы ў еўрапейскім дэкаратыўна-прыкладным мастацтве*

Характарыстыка развіцця заходнееўрапейскага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва эпохі Рэнесансу і барока. Садзейнічанне сацыяльна-палітычнай і рэлігійнай нестабільнасці, эканамічных сувязяў распаўсюджанню рэнесанснага светапогляду, абмен ідэямі, тэхналогіямі. Арыентацыя эпохі Рэнесансу на мастацтва Старажытнага свету (Грэцыі і Рыма); пошук прынцыпаў гармоніі, суразмернасці, прапарцыянальнасці. Элегантнасць, мудрагелістасць і віртуознасць мастацтва Рэнесансу, узаемадзеянне з культурай Усходу, зліццё з мясцовымі традыцыямі.

Спалучэнне імітацый з тэхнічнымі адкрыццямі ў вытворчасці шкла, керамікі, наваўвядзенні тэкстыльнай прамысловасці ў дэкаратыўна-прыкладным мастацтве. Пашырэнне і змяненне характару дэкору: выразнасць, пышнасць, вычварнасць; матывы кандэлябра, аканта, гратэскны арнамент, картушы.

Зараджэнне стылю барока ў часы Позняга Адраджэння. Барока «каралеўскі стыль»: багацце, раскоша, маштабнасць, тэатральнасць, дамінаванне выразных, масіўных форм, багацце колеравых кантрастаў, цікавасць да эфектаў асвятлення, руху. Характэрныя арнаменты: кветкі, акант, лісце, фантастычны арнамент; станаўленне аўрыкулярнага стылю ў дэкоры.

Пашырэнне гандлёвых сувязей з Далёкім Усходам, з'яўленне вырабаў з лаку, фарфору, шоўку; цікавасць да экзотыкі.

*Мэбля.* Мэбля Адраджэння, адыход ад традыцый готыкі, пашырэнне новага матэрыялу – арэха; дамінаванне разнога дэкору; італьянскія і антычны ўплывы на развіццё мэблі; расшырэнне асартыменту: адкрытыя буфеты для посуду, кабінеты, разнастайнасць мэблі для сядзення (крэслы з высокай і вузкай спінкай, скразнымі бакавінамі, крэслы з падлакотнікамі і г. д.), рэнесансныя сталы і ложкі.

Барока – час росквіту вытворчасці мэблі; новыя тэхналогіі (фанераванне, лакіраванне) і новыя віды мэблі: камоды, бюро, кансолі, канапы, шафы, шэзлонгі; складаная геаметрычная форма (наяўнасць пуката-ўвагнутых паверхняў), багацце аздаблення – ужыванне інкрустацыі і маркетры, накладак з пазалочанай бронзы, фларэнтыйскай мазаікі, разьбы, абіўкі з тканіны, скуры. Творчасць А. Буля (Францыя).



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Мастацкая кераміка*. Характэрныя асаблівасці іспана-маўрытанскай керамікі, яе ўплыў на развіццё італьянскай маёлікі. Цэнтры керамічнай вытворчасці – Фаэнца, Арвіета, Сіена, Урбіна. Асартымент: посуд, вазы, аптэчны посуд, кафля. Характар аздаблення: раслінныя матывы, стылізаваныя пёры паўлінаў, гратэскі, арабескі, «рыбіна луска», ваенныя трафеі; партрэтныя выявы, сюжэтныя кампазіцыі (стыль гістарыяту). Паліхромнасць роспісу.

Распаўсюджанне маёлікавай тэхнікі ў Францыю, Нідэрланды, Іспанію. Своеасаблівасць творчасці Бернара Палісі. Германская кераміка з солевай палівай, асаблівасць тэхналогіі, характар вырабаў і аздобы.

Новыя рысы заходнееўрапейскай паліванай керамікі XVII ст.: паступовы адыход ад рэнесанснай арнаментыкі, французскія карункавыя матывы; імітацыя сіне-белага кітайскага фарфору; посуд з чырвонай гліны. Цэнтры вытворчасці: Невер, Руан, Сеўр (Францыя), Стафардшыр (Англія), Фаэнца, Кастэлія (Італія), іспанскі фаянс, Дэлфтскі фаянс (Галандыя), Вестэрвальд, Кёльн, Зігбург (Германія).

Адкрыццё фарфору, асартымент вырабаў і характар аздаблення мейсенскага фарфору, уплыў кітайскіх форм і матываў.

*Мастацкае шкло*. Высокі ўзровень венецыянскага шкла, разнастайнасць тэхнічных прыёмаў (раманскіх, візантыйскіх, блізкаўсходніх), ужыванне тэхналогіі дуцця (свабоднага і ў форму) і гарачага спосабу аздаблення. Шырокі асартымент вырабаў (блюда, талеркі, кубкі, біжутэрыя, люстэркі, асвятляльныя прыборы); разнастайнасць форм шкляных вырабаў. Вытворчасць разнастайнага колеравага шкла: халцэдонавае, «мілефіоры» (тысяча колераў), «лаціма»; ужыванне тэхнік халоднага аздаблення: роспісу эмалямі і золатам, алмазнай гранню (з XVI ст.). Паступовае распаўсюджванне венецыянскай тэхнікі ў іншыя краіны Еўропы.

«Лясное» шкло, асаблівасці тэхналогіі; вырабы: кубкі для віна («рёмер» – паўднёвая Германія), своеасаблівасць іспанскага шкла (дамінаванне тэхнікі свабоднага дуцця і аздаблення).

Агульная даступнасць шкла ў XVII ст.; імітацыя венецыянскіх вырабаў, ускладненне форм і дэкору, выразныя праявы стылю барока ў аздабленні.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Адкрыццё тэхнікі вырабу крышталю, багемскі і англійскі крышталь; характар вырабаў, шырокае распаўсюджванне дэкарыравання гравіроўкай, разьбой. Вынаходніцтва тэхналогіі рубінавага шкла (І. Кункель), ліставога шкла, выраб люстэркаў (Францыя).

*Мастацкія тканіны.* Дэкаратыўныя тканіны Адраджэння: высокі мастацкі ўзровень італьянскіх шаўковых тканін, багатая арнаментальная база: заходнія, усходнія, антычныя элементы, матыў граната – найбольш распаўсюджаны, яго аранжыроўка ў форме каплі (ажывальная форма), буйнарапортныя і дробнарапортныя кампазіцыі. Асаблівасці вытворчасці іспанскага тэкстылю, маўрытанскія ўплывы: арабескі, лісце ў форме паўмесяца, пальметак, лотаса, крыжы, зоркі. Галоўныя цэнтры рэнесанснага ткацтва: Лукка, Венецыя,Таледа, Сівілья і інш.

Мануфактуры ў Арасе, Парыжы, Абюсоне, Баве, Бруселі – цэнтры вытворчасці шпалер у XV–XVIII стст. Віды шпалер: арасы, габелены, мільфлёры (шпалеры серыі «Дама з аднарогам»), вердзюры, гратэскі.

Шпалерныя мануфактуры Бруселя, фарміраванне кампазіцыйнай схемы шпалер, выкарыстанне кардонаў знакамітых мастакоў (Рагір ван дэр Вейдэн, Ханс Мемлінг, серыя шпалер па кардонах Рафаэля для папы Льва X); пошукі прыёмаў перадачы прасторы, аб'ёму і святлацені – шлях страты дэкаратыўных якасцей.

Францыя – лідар у мастацкім ткацтве часоў барока; Ліёнскія мануфактуры, выпрацоўка асабістага стылю, выраб разнастайных па якасці тканін; дэкор: раскошны арнамент з кветак, пладоў, букеты, пейзажна-садовыя матывы; буйнамаштабныя выявы, чыстыя і яркія колеры, аднатонныя фоны.

Асаблівасці развіцця шпалернага мастацтва барока – адыход ад мастацкіх прынцыпаў Сярэдневякоўя, уплыў жывапісу: перадача аб'ёмаў і перспектывы. Творчасць майстроў М. Команса, А. Планша. Распрацоўка тэматычных серый «Гісторыя Людовіка XIV», «Стыхіі», «Поры года», «Гісторыя Аляксандра Македонскага», рэлігійная тэматыка. Англійскія шпалеры (тэпістры); выкарыстанне кардонаў Рубенса, Рафаэля, Ван Дэйка.

*Ювелірнае мастацтва.* Асаблівасці развіцця ювелірнага мастацтва Адраджэння: формаўтварэнне па ўзорах дэкаратыўных дэталяў архітэктуры, прадаўжэнне традыцый готыкі; па-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

шырэнне дыяпазону дэкору: уключэнне ў залатыя і сярэбраныя вырабы каштоўных камянёў, экзатычных матэрыялаў, выкарыстанне колеравых эмаляў. Складанасць кампазіцыі і формы, дамінаванне гратэскных матываў з фігур людзей, раслінных матываў, абстрактных форм; спалучэнне разнастайных тэхнічных прыёмаў, праявы маньерызму.

Разнастайнасць стылістычных падыходаў перыяду барока: станаўленне аўрыкулярнага стылю (Галандыя), скульптурных вырашэнняў (Італія, паўночная Германія), натуралістычна-батанічнага аздаблення (Францыя, Англія); распаўсюджанне альбомаў малюнкаў арнаментаў Д. Маро, Ж. Ціжу.

Вырабы: посуд, туалетныя прыборы, кандэлябры, падсвечнікі, настольныя фантаны.

*Тэма 3. Заходнееўрапейскае дэкаратыўна-прыкладное мастацтва другой паловы XVIII–XIX ст.*

Характарыстыка развіцця заходнееўрапейскага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Змены мастацкіх стыляў на працягу XVIII–XIX стст.: барока, ракако, класіцызм, неастылі, мадэрн.

Позняе барока, ракако: празмернае багацце матэрыялаў, тэхнік; у аздабленні ь, асіметрыя, гнуткасц перапляценняў парасткаў, кветкавых гірлянд, хваляў, ракавін, адчуванне мігатлівага руху; індывідуальнасць інтэрпрэтацый мастакоў ракако.

Класіцызм – стыль выкліканы да жыцця захапленнем антычнасцю (Рэспубліканскім Рымам і Старажытнай Грэцыяй) і ўзмацненнем адмоўных адносін да празмернага багацця стылю ракако; архітэктанічнасць, прастата і строгасць форм, яснасць канструкцыі, гарманічнасць прапорцый, вытанчанасць дэталяў; мяккія і складаныя колеравыя гармоніі. Ампір – завяршэнне эвалюцыі класіцызму, арыентацыя на культуру Імператарскага Рыма, Старажытнай Грэцыі, егіпецкае пластычнае мастацтва. Адметныя рысы – урачыстасць, раскоша, масіўнасць і лапідарнасць форм, багацце дэкору, яго перагрувашчанасць арабескамі, пальметамі, ваеннай атрыбутыкай, фантастычнымі матывамі.

Неастылі (гістарызм) – вынік рэтраспектыўнага мастацкага мыслення, аслабленне інтарэсу да класіцызму, развіццё ра-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

мантычных настрояў, крыніцы натхнення: готыка, ракако, барока, рэнесанс, усходняе і народнае мастацтва.

Мадэрн – эстэтыка дынамічнай выгнутай лініі, разнастайнасць мастацкіх форм і кампазіцыйных прыёмаў, плаўны пераход канструкцыі ў форму, а формы ў дэкор; разнастайнасць напрамкаў, школ, аўтарскіх стыляў.

*Мэбля.* Праявы стылю ракако ў адказе ад архітэктанічнасці, адсутнасці прамых ліній; памяншэнне памераў мэблі, яе большая зручнасць; з'яўленне новых відаў сталоў, крэслаў, шаф, ложкаў; распаўсюджванне гарнітураў; афарбоўванне мэблі ў светлыя колеры; у дэкоры – экзатычныя пароды дрэва, мармур, шоўк, колеравыя лакі, бронзавыя дэталі, залачэнне, маркетры, роспіс. Знакамітыя майстры: Ш. Крэсан (Францыя), А. Рэнтген (Германія), Т. Чыпендэйл (Англія).

Характэрныя рысы мэблі класіцызму – паступовае спрамленне канструктыўных ліній, прамалінейнасць і сіметрычнасць, яснасць і гарманічнасць прапорцый, спакойная ўраўнаважанасць частак; дамінаванне ў дэкоры антычных матываў. Шырокае распаўсюджанне камодаў, пісьменных сталоў, дамскіх бюро, секрэтэраў; аздабленне ў тэхніцы маркетры, бронзавых накладных медальёнаў, фарфоравыя ўстаўкі, спецыяльная абіўка.

Прэзентатыўны характар мэблі ампіру, арыентацыя і паўтор мэблі антычнасці, новыя тыпы мэблі: горкі, серванты, круглыя сервіровачныя сталы, кушэткі-рэкам'е, столікі – гэрыдоны, напольныя люстэркі-псішэ; тэндэнцыя да масіўнасці, цяжкаважкасці; шырокае ўжыванне бронзавай пластыкі (апорныя канструкцыі ў выглядзе фігур грыфонаў, карыятыд, атлантаў і інш.); дамінаванне ў дэкоры антычных матываў. Зварот да неастыляў, нязначнасць інавацый у форме, зручнасць і практычнасць мэблі, яе нязначная мастацкая каштоўнасць у XIX ст.

Дзве лініі развіцця ў мэблі мадэрну: дэкаратыўная (складаныя формы і контуры) і канструктыўная (прамалінейнасць, ясная пабудова). Асаблівасці дзейнасці творчых майстэрань і школ; арыентацыя на прыродныя матывы (кветкі, насякомыя) у работах Э. Гале, Л. Мажарэля; адыход ад пераймання прыроды ў бок абстракцыі (А. ван дэ Вельдэ, В. Орт).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Мастацкая кераміка.* Другая палова XVIII–XIX ст. – вытворчасць разнастайных відаў керамікі: фаянс, фарфор, касцяны фарфор, каменныя масы.

Захапленне кітайскім мастацтвам, імкненне мануфактур да пераймання прадукцыі другіх керамічных цэнтраў або краін – агульныя рысы еўрапейскага керамічнага мастацтва часоў ракако. Праявы стылю ракако: з’яўленне хвалістых бакоў талерак, блюд, збаноў, ляпнога дэкору, выкарыстанне C- і S-падобных завіткоў, дамінаванне асіметрыі, цікавасць да прыродных форм.

Разнастайнасць керамічных вырабаў: сталовы посуд, чайныя і кафейныя сервізы, карпусы гадзіннікаў, кандэлябры; папулярнасць дробнай пластыкі (фігуркі дам і кавалераў, персанажы камедыі дэль артэ і інш.). Асаблівасці нямецкага фарфору (Мейсен), англійскай керамікі (Чэлсі), французскага (Руан, Невер, Сеўр) і рускага фарфору.

Змены ў формаўтварэнні і дэкоры з часоў класіцызму: дамінаванне форм у выглядзе антычных амфар і кратэраў, сіметрыя, у аздабленні – багатыя трохмерныя дэталі (акант, лаўровыя гірлянды, стужкі, канялюры, медальёны і інш.), перавадны пячатны дэкор (міфалагічныя, пастаральныя і жанравыя сцэнкі); колеравы фон (часцей ярка-блакітны); распаўсюджанне вырабаў з бісквіту (мініяцюрныя скульптуры, упрыгожанні для стала). Творчасць Дж. Веджвута, знакамітыя сервізы для Кацярыны II.

Разнастайнасць форм керамічнай вытворчасці XIX ст.; зварот да стыляў мінулага.

Творчыя пошукі мастакоў керамікі стылю мадэрн; разнастайнасць формаўтварэння і дэкарыравання, зварот да прыродных форм, усходняй (японскай, персідскай), народнай і ранняй керамікі. Серыйнасць вытворчасці фарфоравага і фаянсавага посуду; мадэрнізацыя і тэхналагічныя інавацыі.

*Мастацкае шкло.* Развіццё крыштальнага шкла ў XVIII ст., Багемія і Сілезія – самыя ўплывовыя і вядучыя вытворцы шкляных вырабаў у стылістыцы ракако, шырокая папулярнасць «багемскага» стылю па ўсёй Еўропе. Пэўная стылістычная агульнасць еўрапейскага шклароробства.

Пашырэнне асартыменту шклянога посуду, асабліва для напояў, выпрацоўка трох тыпаў аб’ёмаў у залежнасці ад сорту ві-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

на, разнастайнасць вырашэнняў форм ножак (балясінападобныя, вітыя, верацёнападобныя).

Распаўсюджаныя спосабы атрымання дэкору: гравіроўка, роспіс эмалямі, золатам, разьба, шліфоўка; тэматыка: пастаральныя сцэны, пейзажы, караблі, руіны, экзотыка; арнаментальныя матывы з завіткоў, стужак, увядзенне надпісаў забаўляльнага характару.

Праявы класіцызму ў формаўтварэнні і характары дэкору; моцны ўплыў на еўрапейскія цэнтры брытанскага шкла, яго індывідуальны стыль, дамінаванне разьбы ў дэкоры, стыль «Адама»; прадаўжэнне тэхналогій багемскага апалавага шкла ў французскай вытворчасці; тэхналагічныя ўдасканаленні багемскіх майстроў: залачонае шкло, узбагачэнне колеравай палітры шкла.

Новаўвядзенні ў прамысловай вытворчасці шкла XIX ст. (прэсаванае шкло, траўленне); зварот да стыляў і тэхналогій мінулага («мілефіоры», венецыянская ніць, камейнае шкло); эксперыменты ў колеравым шкле, выраб крышталю с падфарбоўваннем, шкла з бурбалкамі, ірызіраванае шкло, інтарэс да роспісу эмалямі (стыль «Мэры Грэгары»), Францыя — вядучы цэнтр новага дызайну, знакаміты крышталь «бакара».

Знакамітыя майстры стылю арт-нуво: Эміль Гале, рэалістычныя прыродныя формы і матывы (грыбы, стракозы, матылі), разнастайнасць тэхнічных прыёмаў («натурстыль» – серыя «Геалогія»), яго вучань Луіс Тыфані, эксперыменты з формай і паверхняй вырабаў (тэхніка «фаўрыль»).

*Мастацкія тканіны*. Змены ў трактоўцы тэкстыльных матываў часоў ракако: паступовае памяншэнне памераў, адыход ад сіметрыі, ракайльны матыў, які сплятаецца з раслінамі або ператякае ў раслінныя формы, малюнкі ў выглядзе карункаў і футра; дамінаванне светлых пастэльных тонаў; разнастайнасць стылістыкі малюнкаў мастакоў-дэкаратараў. Узмацненне тэндэнцыі збліжэння шпалернага ткацтва да жывапісу (больш 400 адценняў колераў нітак); кампазіцыйная схема: цэнтр – копія жывапіснага палатна, вакол – дэкаратыўны бардзюр з раслінных матываў; найбольш вядомыя серыі «Дон Кіхот», «Паляванне Людовіка XVI».

Асаблівасці кампазіцыі класіцыстычных тканін, падпарадкаванасць арнаменту архітэктуры, дамінаванне антычных маты-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ваў, тэмы «зварот да прыроды», павышэнне ролі фону. З'яўленне творчых дынастый мастакоў-дэкаратараў, ткачоў. Творчасць Ф. Ласаля. Развіццё набіванкі, два напрамкі ў дэкоры бавоўняных тканін: стыль Жуй з матывамі палявання і эльзаскі з кветкамі на паласатым фоне. «Персідскія» набіванкі. Пераход да стылю ампір.

Імітацыя жывапісу ў габеленах; з'яўленне новага тыпу кампазіцый – алентураў. Агульнае згасанне гэтага віду дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва на працягу XIX ст.

Першыя спробы аднаўлення шпалернага мастацтва У. Морысам (Англія); шпалера «Паданне аб каралю Артуры»; праявы стылю мадэрн.

Крыніцы тэкстыльнай арнаментыкі мадэрну: прыродныя формы мясцовай флоры і фаўны, мікраформы ўнутранай пабудовы раслін, мастацтва Усходу, Егіпта, Палінэзіі; пластычны прынцып: бясконцы рух, пераход адной формы ў другую; вытанчаная колеравая палітра.

*Ювелірнае мастацтва*. Эстэтыка плаўных завіткоў і форм ракавін у вырабах з металу стылю ракако, уключэнне раслінных і жывёльных форм, іх складанае ўзаемадзеянне. Роля творчасці і альбома малюнкаў і мадэляў французскага майстра Ж.-О. Мейсанье ў распаўсюджанні ўзораў ракако; спецыфіка развіцця ювелірнага мастацтва ў еўрапейскіх краінах; росквіт апрацоўкі серабра; багацце і разнастайнасць ювелірных вырабаў: парадны посуд, кубкі, чашы, кафейнікі, чайнікі, падносы, скульптурная пластыка, рамы для люстэркаў, падсвечнікі, кандэлябры, футаралы для гадзіннікаў.

Класіцызм «гладкі стыль», распаўсюджанне строгага адыход ад складанай пластыкі і празмернага аздаблення ракако; дамінаванне простых класічных форм, папулярнасць форм урны або вазы; аздабленне фрызамі, акантамі, фестонамі, гірляндамі, літымі элементамі; павышэнне ролі незапоўненай дэкорам прасторы сасудаў; прамысловы характар вытворчасці сталовага серабра, вынаходніцтва спосабаў серабрэння медзі. Праявы стылю ампір: круглыя формы, кантрасты, скульптурныя ўпрыгожанні ў выглядзе арліных галоў, пальмет, маскі льва і інш.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Уплыў новых тэхналогій (гальванапластыкі, паравых машын), зварот да стыляў мінулага ў XIX ст., вырабы з серабра і металаў у стылістыцы неаракако, неаготыкі, неарэнесансу.

Росквіт ювелірнага мастацтва ў перыяд стылю арт-нуво. Прырода – Запоўная тэма вырабаў. Асаблівасці творчых пошукаў Ж. Фуке, Р. Laліка (ужыванне тэхнікі эмалі, паўкаштоўных камянёў), А. ван дэ Вельдэ (спалучэнне арганічных ліній са скульптурнымі формамі), Ч.-Р. Эшбі, А. Нокс (зварот да кельтскіх матываў) і інш.

## Раздзел 3. Беларускае дэкаратыўна-прыкладное мастацтва

### *Тэма 1. Этапы развіцця беларускага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва*

Агульная характарыстыка развіцця беларускага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Перыядызацыя дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва Беларусі. Паступовае развіццё мастацкіх рамёстваў, з’яўленне першых цэхавых арганізацый; узаемадзеянне разнастайных відаў мастацтва. Віды дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, асаблівасці іх развіцця, перыяды найбольшага росквіту, уплыў заходнееўрапейскіх стыляў і майстроў на развіццё дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва на беларускіх землях, усходнія ўплывы і іх праявы ў творах мясцовых майстроў, нацыянальныя асаблівасці. Уплыў на развіццё дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва іншых відаў пластычных мастацтваў.

### *Тэма 2. Развіццё мастацтва керамікі*

*Побытавая і архітэктурная кераміка* часоў старажытнабеларускіх княстваў. Пашырэнне ручнога ганчарнага круга. Спосабы фармоўкі: выцісканне, налеп, выцягванне. Формы і асартымент. Характар аздаблення і матывы. Вытворчасць керамічнай пліткі; тэхналогія вырабу, выкарыстанне палівы; формы, дэкор, асаблівасці ўкладкі.

*Беларуская кафля,* прызначэнне і формы, віды. Характар аздаблення – геаметрычныя ўзоры, выявы раслін і жывёл, сюжэтныя кампазіцыі на бытавыя, гістарычныя і рэлігійныя тэмы. XVI – першая палова XVII ст. – росквіт беларускага кафлярства. Паліхромныя палівы, характар дэкарыравання. Творы бе-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ларускіх майстроў («цанінnікаў») за межамі беларускіх зямель. Змены ў памерах, асаблівасці мадэліроўкі, выкарыстанне гіпсавых форм, дамінаванне кобальтавага роспісу па гладкай паверхні ў кафлярстве XVIII ст. Рэльефныя паліхромныя пліткі, фасонныя дэталі – праявы стылю мадэрн.

*Вытворчасць фаянсу ў Беларусі.* XVIII ст. – перыяд імітацыі фаянсу, усталяванне новага прынцыпу ў тэхналогіі: роспіс вогнетрывалымі фарбамі; адыход ад паліхроміі, рэдкі арнамент, спакойны каларыт, дамінаванне белага фону; з’яўленне дэкаратыўных талерак і ваз. Другая палова XVIII ст. – з’яўленне беларускага фаянсу. 1742 г. – адкрыцц
фаянсавай мануфактуры ў Свержані. Асартымент: фаянсавыя сервізы, вазы, міскі, паўміскі, салатніцы, чаркі, падносы, аптэчны посуд, фігуры для аснашчэння алтароў, дробная пластыка, кафля. Выраб посуду для сервізаў – пераважна на ганчарным крузе; аздабленне ляпнінай у стылі позняга барока і ракако, малюнкамі кветак, птушак, з уключэннем герба ўладальнікаў, роспіс кобальтам, цёмна-зялёнымі, карычневымі фарбамі. Творчасць прыдворнага мастака Ксаверыя Гескага. 1777–1779–1830-я гг. дзейнасць фабрыкі фаянсавых вырабаў у Целяханах. Асартымент вырабаў: посуд, кафля, дэкаратыўная скульптура, разнастайныя керамічныя прадметы для культавых і свецкіх інтэр’ераў (камплекты аздобы камінаў, дробная пластыка, сталовы посуд і інш.); ужыванне празрыстых паліхромных паліў; выкарыстанне ў аздобе рэльефнага дэкору (жаночыя маскі, гірлянды з лістоў і кветак, букетаў) – масіўнасць прапорцый, цяжкаважкасць.

Уплыў італьянскага і французскага фарфору ў ранняй прадукцыі мануфактур; дэкор з багатага раслiннага арнаменту – гірляндаў пладоў і кветак, пальметаў, маскаронаў, у позняй прадукцыі – форма больш строгая, лаканічная, дэкор пазбаўляецца пышнасці, аздабленне набывае стрыманасць.

### *Тэма 3. Развіццё вытворчасці шкла*

*Старажытнабеларускае шкло.* Спосабы прыгатавання і апрацоўкі шкляной масы: выдзіманне, выцягванне праз шаблоны-матрыцы, віццё, скручванне, залачэнне і серабрэнне. Упрыгажэнні, аптэкарскі і побытавы посуд, смальтавая мазаіка. Тэхнікі дэкарыравання. Цэнтры рамяства: Полацк, Гродна, Тураў,



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Навагрудак і інш. Асаблівасці развіцця беларускага шкла XIV–XVI стст. – вылучэнне двух перыядаў. Развіццё вытворчасці шкла ў XVII ст., дробныя гуты і буйныя мануфактуры; шырокае распаўсюджанне неасветленага шкла для побытавага ўжытку, тэхналогіі адвольнага выдзімання ці ў форму. Разнастайнасць асартыменту. Прыёмы аздаблення гарачым і халодным спосабам.

*Урэцка-налібокскае шкло.* Шкларобчыя мануфактуры князёў Радзівілаў у мястэчках Урэчча і Налібокі. Паўтара стагоддзя дзейнасці мануфактур, майстры: Дубіцкія, Рымашэўскія, Залескія, Санцэвічы, Александровічы і інш. Віды шкла: бясколернае – самае распаўсюджанае, крышталь, рубінавае, малочнае, каляровае вельмі рэдкіх і насычаных адценняў: цёмна-зялёнае, цёмна-сіняе, чырвонае, цёмна-фіялетавае. Шырокі асартымент вырабаў: побытавы і мастацкі посуд, сталовыя камплекты і сервізы, пацешны посуд, асвятляльныя прыборы, люстэркі, дробная шкляная пластыка. Келіхі – найбольшая разнастайнасць форм. Асноўныя тэхнікі аздаблення: алмазнае граненне, накладкі, гравіраванне, разьба па шкле. Тэматыка гравіровак, стылістычныя змены ў характары і тэматыцы гравіровак. Стылістычныя змены і іх праявы ў фармаўтварэнні, характары і дамінуючых тэхніках аздаблення; уплывы (нямецкія, англійскія).

Асартымент асвятляльных прыбораў: люстраныя рэфлектары, падсвечнікі, кандэлябры, люстры на медных пазалочаных і пасярэбраных каркасах, жырандолі. Першапачатковая спецыялізацыя Урэцкай мануфактуры («мануфактура зверцядляна») на вытворчасці люстэркаў, арыентацыя на заходнееўрапейскія ўзоры (багемскія, французскія і англійскія), дзейнасць дрэздэнскага майстра Х. Т. Шэрбера. Канфігурацыі люстранога поля, рамы і іх мастацкае вырашэнне.

Паступовы пераход да фабрычнай вытворчасці, укараненне новых тэхналогій, выкарыстанне больш дасканалага абсталявання – асаблівасці развіцця шкларобнай вытворчасці на працягу XIX – пачатку XX ст. Буйныя заводы ў вёсках Бярозаўка, Нова-Барысаў, акцыянерныя таварыствы. Тэхналогіі фармавання; тэхнікі аздаблення. Крышталь і асаблівасці яго дэкарыравання, матывы. Змены ў формах і аздобах шкляных вырабаў адпаведна пануючым стылям і напрамкам.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Тэма 4. Асаблівасці развіцця вытворчасці мастацкіх тканін*

Гісторыя развіцця вытворчасці мастацкіх тканін з бавоўны, ільну, воўны, шоўку. Тканіны ў інтэр'еры мяшчанскага і шляхецкага жылля. Мануфактурная вытворчасць тканін у Беларусі.

*Шпалерная вытворчасць.* Арганізацыя ў 1750-х гг. Міхалам Радзівілам «тапісярні» ў Карэлічах. Серыі шпалер «Імператар Карл V Габсбургскі даруе Радзівілу княжацкі тытул», «Узяцце ў палон Станіслава Міхаіла Крычэўскага пад Лоевам у 1649 годзе», «Парад войск пад Заблудавам», фрагмент шпалеры «Бітва на рацэ Славечна». Партрэтныя шпалеры. Стылістычныя асаблівасці, кампазіцыйная і колеравая пабудова шпалер, сюжэтная аснова; мастакі – Гескія (бацька і сын), Скажыцкі, Лютніцкі, Абрахам ван Вестэрфельд; ткачы – Настасся Маркевіч і Марыя Кулакоўская. Гродзенскія шпалеры, стылістыка барока і ракако, уплыў французскіх майстроў. Слонімская серыя з дванаццаці шпалер, дзве з іх: «Флейтыст», «Вакханка», асаблівасці кампазіцыйнай пабудовы, стылістыка. XIX ст. – заняпад шпалернай вытворчасці.

*Слуцкі пояс.* Сацыяльная і формаўтвараючая роля пояса ў шляхецкім касцюме. Усходнія паясы – праваобраз слуцкага пояса; геаграфія (краіны Азіі – Турцыя, Афганістан, Сірыя і Персія), асаблівасці кампазіцыйных і колеравых рашэнняў. Слуцкая персіярня, дзейнасць з другой паловы XVIII ст. – па 1846 г. Кіраўніцтва: Ян Маджарскі, з 1777 г. – Лявон Маджарскі (сын); характар арганізацыі вытворчасці.

Мастацкія асаблівасці слуцкага пояса: памеры, кампазіцыйная пабудова, характар выкарыстоўваемых матываў, іх арганізацыя на вырабе, варыянты рашэння сярэдніка (папярочныя гладкія або ўзорыстыя палосы, «рыбіна луска», «у гарошак») і галовак, надпісы. Літыя паясы, асаблівасці тэхналогіі.

Калекцыі слуцкіх паясоў у зборах музеяў Варшавы, Кракава, Львова, Масквы, Вільнюса, Каўнаса; Музей старажытнабеларускай культуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Выкарыстанне слуцкіх паясоў у культавым адзенні.

*Тэма 5. Мастацкая апрацоўка металаў*

*Апрацоўка металу.* Металы і сплавы. Тэхнікі апрацоўкі і дэкарыравання. Пашырэнне званаліцейнай справы ў XIV–XVI стст. Моладаўскі звон – памеры, характар аздаблення. Выраб буйна-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

маштабных прадметаў: ствалоў гармат, каваных і літых элементаў для будынкаў. Далейшае развіццё звоналіцейнай справы, кавальства. Ракальныя і класіцыстычныя тэндэнцыі ў мастацкай апрацоўцы металу. Разнастайнасць вырабаў для палацавых інтэр'ераў, шырокі асартымент сярэбранага посуду. Аздабленне конскай збруі і транспартных сродкаў, ёмістасцей для перавозкі. Устойлівы попыт у XIX – пачатку XX ст. на літыя архітэктурныя элементы, разнастайнасць асартыменту, выкарыстанне ў дэкоры стылізаваных раслінных матываў у спалучэнні з геаметрычнымі формамі. Пашырэнне кавальства, тэхнікі выканання каваных вырабаў, ужыванне ліставога і палоснага пракату. Вырабы з каляровых металаў: медзі, волава, латуні, бронзы. Асартымент (дэкаратыўныя вазы, падстаўкі, абклады, падсвечнікі, накладкі і інш.). Зварот да стылістыкі мінулых часоў.

*Кірункі развіцця ювелірнай справы*: выраб прадметаў культавага прызначэння, зброі, посуду, аздоб і элементаў касцюма. Асартымент ювелірных вырабаў перыяду старажытнабеларускіх княстваў. Асаблівасці кампазіцыйнага і дэкаратыўнага рашэнняў прадметаў культавага прызначэння: абкладаў і абразоў. Разнастайнасць літургічных прадметаў: запрастольныя і напрастольныя, алтарныя крыжы, даразахавальніцы, манстранцы, дараносіцы, паціры, кадзілы і інш. Тэхнікі апрацоўкі металу. Крыж Еўфрасінні Полацкай (1161 г.) Лазара Богшы – славуты твор ювелірнага і эмальернага мастацтва старажытнабеларускіх зямель. Асаблівасці кампазіцыйнага і дэкаратыўнага рашэння. Гатычныя і рэнесансныя рысы ў стылістыцы ювелірных твораў культавага прызначэння. Праявы барочнай стылістыкі ў вырашэнні літургічных прадметаў, багацце дэкору (манстранцы з касцёла Іаана Хрысціцеля в. Воўпа, касцёла Узнясення Маці Боскай в. Будслаў). Разнастайнасць пластычных рашэнняў абкладаў абразоў XVIII ст.: «Ганна і Марыя з Хрыстом» з касцёла Сэрца Ісуса (в. Пелішча), «Маці Боская Адзігітрыя» (Георгіеўская царква, Давыд-Гарадок), «Маці Боская Адзігітрыя Смаленская» (г. Дзісна). Класіцыстычныя тэндэнцыі ў ювелірным мастацтве, абклады абразоў «Пакланенне вешчуноў» з касцёла Пятра і Паўла (в. Дрысвяты), «Маці Боская Замілаванне» з царквы Раства Багародзіцы (в. Парахонск).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Тэма 6. Мастацкая апрацоўка дрэва і косці*

*Апрацоўка дрэва і косці:* самыя пашыраныя і старажытныя рамёствы. Даступнасць і таннасць матэрыялу, нескладаны працэс апрацоўкі, мінімальная колькасць інструментаў. Тэхнічныя прыёмы: дрэва секлі, пілавалі, свідравалі, стругалі, дзяўблі, тачылі, абпальвалі, таніравалі, распісвалі, фарбавалі, паліравалі, лакіравалі; вырабы ўпрыгожвалі разьбой, роспісам, выпальваннем, інкрустацыяй.

Старажытныя знаходкі вырабаў з косці – Асавец, Ваўкавыск, Лукомль, Мінск, Полацк, Мсціслаў, гарадзішчы.

Манументальна-дэкаратыўная разьба: віды, час распаўсюджвання: да XV–XVI стст. нескладаная контурная, трохграннавыемчатая, нізкарэльефная разьба геаметрычнага характару, з XVII ст. – высокарэльефная, скульптурная, ажурная разьба.

«Беларуская рэзь» (флемская – ад ням. Flamme – полымя) – аб'ёмная залачоная разьба. Палацавыя інтэр'еры – Гродзенскі каралеўскі замак, Крэўскі замак, Мірскі замак. Царкоўныя інтэр'еры. Разныя іканастасы, царскія брамы. Царская брама з Праабражэнскай царквы в. Варанілавічы Пружанскага р-на (канец XVI ст.), іканастас царквы в. Хаціслаў Маларыцкага р-на (XVIII ст.), іканастас сабора Св. Мікалая ў Магілёве (канец XVII ст.), Троіцкай і Юр'еўскай цэркваў у Віцебску (XVII ст.). Работа беларускіх майстроў у Маскоўскай дзяржаве: іканастас Смаленскага сабора Новадзявочага манастыра ў Маскве. Клім Міхайлаў са Шклова, Восіп Андрэеў з Оршы, старац Арсеній. Палац Аляксея Міхайлавіча ў Каломенскім.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ

| Назва раздзела, тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | | | | Колькасць гадзін КСР | Форма кантролю ведаў |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | усяго | лекцыі | практычныя заняткі | семінарскія заняткі | | |
| ***Уводзіны*** | 2 | 2 | | | | |
| **Раздзел I. Станаўленне дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва** | | | | | | |
| *Тэма 1.* Неалетычнае дэкаратыўна-прыкладное мастацтва | 2 | 2 | | | | даклад |
| *Тэма 2.* Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва старажытных цывілізацый | 4 | 2 | 2 | | | |
| *Тэма 3.* Развіццё дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва антычнасці | 6 | 2 | | 2 | 2 | рэферат |
| *Тэма 4.* Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва Старажытнага Усходу | 2 | | 2 | | | |
| **Раздзел 2. Еўрапейскае дэкаратыўна-прыкладное мастацтва** | | | | | | |
| *Тэма 1.* Асаблівасці развіцця еўрапейскага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва Сярэдневякоўя | 2 | 2 | | | | |
| *Тэма 2.* Рэнесансныя і барочныя рысы ў еўрапейскім дэкаратыўна-прыкладным мастацтве | 8 | 2 | 2 | 2 | 2 | прэзентацыя |
| *Тэма 3.* Заходнееўрапейскае дэкаратыўна-прыкладное мастацтва другой паловы XVIII–XIX ст. | 10 | 2 | 4 | 2 | 2 | |
| **Раздзел 3. Беларускае дэкаратыўна-прыкладное мастацтва** | | | | | | |
| *Тэма 1.* Этапы развіцця беларускага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва | 2 | 2 | | | | рэферат |
| *Тэма 2.* Развіццё мастацтва керамікі | 6 | | 2 | 2 | 2 | |
| *Тэма 3.* Развіццё вытворчасці шкла | 6 | 2 | 2 | 2 | | |
| *Тэма 4.* Асаблівасці развіцця вытворчасці мастацкіх тканін | 6 | 2 | | 2 | 2 | |
| *Тэма 5.* Мастацкая апрацоўка металаў | 4 | | 2 | | 2 | |
| *Тэма 6.* Мастацкая апрацоўка дрэва і косці | 6 | 2 | 2 | | 2 | |
| **Разам…** | **66** | **22** | **18** | **12** | **14** | |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## Літаратура


*Асноўная*

*1.* Гісторыя беларускага мастацтва : у 6 т. / рэдкал. : С. В. Марцэлеў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Навука і тэхніка, 1987–1994. – Т. 1 . – 1987. – 304 с.; Т. 2. – 1988. – 384 с.; Т. 3. – 1989. – 448 с.; Т. 4. – 1990. – 352 с.; Т. 5. – 1992. – 256 с.; Т. 6. – 1994. – 375 с.

*2. Жук, В. И.* Декоративно-прикладное искусство Беларуси XVIII–XX веков: становление и тенденции развития / В. И. Жук. – Минск : Беларус. навука, 2006. – 319 с.

*3. Моран, А.* История декоративно-прикладного искусства: от древнейших времен до наших дней / А. Моран. – М. : Искусство, 1982. – 577 с.

*4. Константинова, С.* История декоративно-прикладного искусства / С. Константинова. – М. : Феникс, 2004. – 194 с.

*Дадатковая*

*1. Аттенберн, Р.* Энциклопедия антиквариата / Р. Аттенберн. – М. : БММ АО, 1997. – 332 с.

*2. Бех, Н. И.* Технология художественного литья / Н. И. Бех, М. Л. Иоффе. – СПб. : Изд-во политех. ун-та, 2006. – 455 с.

*3. Бирюкова, Н. Ю.* Западноевропейские шпалеры в Эрмитаже: XV – начало XVI века / Н. Ю. Бирюкова. – Л. : Артия–Сов. художник, 1965. – 244 с.

*4. Бирюкова, Н. Ю.* Западноевропейские набивные ткани XVI–XVIII вв. / Н. Ю. Бирюкова – М. : Искусство, 1973. – 175 с.

*5. Ганецкая, І. У.* Маёліка на Беларусі ў XI–XVIII стст. / І. У. Ганецкая. – Мінск : Навука і тэхніка, 1995. – 120 с.

*6. Дулькина, Т. И.* Русская керамика и стекло XVIII–XIX вв. / Т. И. Дулькина [и др.]. – М. : Искусство, 1987. – 326 с.

*7. Здановіч, Н. І.* Беларуская паліваная кераміка XI–XVIII стагоддзяў / Н. І. Здановіч, А. А. Трусаў. – Мінск : Навука і тэхніка, 1993. – 183 с.

*8. Лазука, Б. А.* Гісторыя мастацтваў / Б. А. Лазука. – 2-е выд. – Мінск : Беларусь, 2003. – 399 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*9. Ланцетти, А. Г.* Изготовление художественного стекла / А. Г. Ланцетти, М. Л. Нестеренко. – М. : Высш. шк., 1987. – 304 с.

*10. Лукич, Г. Е.* Конструирование художественных изделий из керамики / Г. Е. Лукич. – М. : Высш. шк., 1979. – 183 с.

*11. Лямин, И. В.* Художественная обработка металлов / И. В. Лямин. – М. : Машиностроение, 1988. – 112 с.

*12. Руденко, С. И.* Древнейшие в мире художественные ковры и ткани из оледенелых курганов Горного Алтая / С. И. Руденко. – М. : Искусство, 1968. – 134 с.

*13. Соболев, Н. Н.* Стили в мебели / Н. Н. Соболев. – М. : Искусство, 1996. – 350 с.

*14. Тревер, К. В.* Сасанидское серебро. Художественная культура Ирана III–VIII вв. / К. В. Тревер, В. Г. Луконин. – М. : Искусство, 1987. – 156 с.

*15. Трызна, Д. С.* Беларускія дываны і габелены / Д. С. Трызна. – Мінск : Навука і тэхніка, 1981. – 127 с.

*16. Якуніна, Л. І.* Слуцкія паясы / Л. І. Якуніна. – Мінск : Навука і тэхніка, 1960. – 23 с.

*17. Яніцкая, М. М.* Беларускае мастацкае шкло (XVI–XVIII стст.) / М. М. Яніцкая. – Мінск : Навука і тэхніка, 1977. – 328 с.

*18. Яніцкая, М. М.* Беларускае мастацкае шкло: XIX – пачатак XX ст. / М. М. Яніцкая. – Мінск : Навука і тэхніка, 1984. – 246 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Пералік заданняў
## кіруемай самастойнай работы студэнтаў

Самастойная праца накіравана на фарміраванне навыкаў работы студэнтаў з літаратурай, яе падборам адпаведна тэматыцы, аналізам матэрыялу і яго прадстаўленню ў выглядзе рэфератыўнага паведамлення, прэзентацыі. Выкананне такога роду работы дае магчымасць студэнтам паглыбіць свае веды і прымяніць іх пры напісанні курсавых і дыпломных работ, навукова-даследчых артыкулаў. Работы прадстаўляюцца на практычных занятках і па жаданні студэнта могуць прыняць удзел у канферэнцыях, конкурсах навукова-даследчых работ студэнтаў.

1. Асноўнай крыніцай для азначэння часавых, стылістычных і відавых характарыстык вырабаў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва з'яўляюцца работы: Моран, А. История декоративного искусства / А. Моран. – М. : Искусство, 1982. – 578 с.; Гісторыя беларускага мастацтва: у 6 т. / рэдкал.: С. В. Марцэлеў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Навука і тэхніка, 1987–1994. – Т. 1. – 1987. – 304 с.; Т. 2. – 1988. – 384 с.; Т. 3. – 1989. – 448 с.; Т. 4. – 1990. – 352 с.; Т. 5. – 1992. – 256 с.; Т. 6. – 1994. – 375 с.

2. Абавязкова выкарыстанне дадатковых крыніц па гісторыі дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, якія прысвечаны разглядаемаму колу пытанняў (раздзелы: гісторыя мастацтваў, падраздзел: гісторыя ДПМ – 85.1, археалогія, этнаграфія, тэхналогія – 37.2).

Рэкамендаваная структура разгляду матэрыялу: агульная характарыстыка эпохі і кірунку развіцця пластычных мастацтваў; вызначэнне ўжываемых тэхналогій, апрацоўкі; асаблівасці дэкору: арнамент, размяшчэнне, тэхніка нанясення; аналіз найбольш вядомых вырабаў; характарыстыка асаблівасцей творчых метадаў мастакоў дадзенага віду дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва.

3. Рэкамендаваныя тэмы рэфератыўных паведамленняў:

Стылістычныя асаблівасці арнаментаў у вырабах дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва

Асаблівасці развіцця керамікі старажытных цывілізацый

Мастацкія асаблівасці еўрапейскай маёлікі Сярэдневякоўя і Адраджэння

Творчасць Бернара Палісі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Мастацкія тканіны: разнастайнасць відаў
Асаблівасці развіцця карункапляцення
Асаблівасці развіцця мастацтва вышыўкі
Мільфлёры – выразныя творы шпалернага мастацтва
Асаблівасці мастацкай мовы вырабаў майстэрні габеленаў
Асаблівасці развіцця шпалернага мастацтва ў Беларусі
Сучасны габелен, характар развіцця
Праявы стылю ў мэблі Адраджэння і барока
Творчасць А. Буля
Творчасць Т. Чыпендэйла
Творчасць Эміля Гале
Мастацкія якасці старажытнага шкла
«Венецыянскі стыль» у шкловытворчасці
Новыя і «старыя» тэхналогіі шкловытворчасці XIX – пачатку XX ст.
Праявы стыляў у вырабах Урэцкай і Налібокскай мануфактур
«Звярыны стыль» і яго вытокі
Нямецкае ювелірнае мастацтва і яго цэнтры
Асаблівасці цэхавай арганізацыі рамеснікаў, уплыў на развіццё дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва.

**Пералік рэкамендаваных сродкаў дыягностыкі вучэбнай дзейнасці студэнтаў**

Для кантролю за засваеннем студэнтамі вучэбнага матэрыялу выкарыстоўваюцца наступныя сродкі дыягностыкі:

– праверка засваення лекцыйнага матэрыялу: апытанне, тэсціраванне, разгорнутыя пісьмовыя адказы па асобных тэмах;

– праверка вынікаў вучэбна-даследчыцкай дзейнасці: заслухоўванне паведамленняў, падрыхтоўка дакладаў на студэнцкія навуковыя канферэнцыі, семінары, круглыя сталы па праблемах вучэбнай дысцыпліны;

– праверка практычнай падрыхтоўкі: прагляд мультымедыйных прэзентацый, фота- і відэаматэрыялаў, падборак разнастайнага ілюстратыўнага і дадатковага матэрыялу па разглядаемых тэмах.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Вучэбнае выданне*

# ГІСТОРЫЯ ДЭКАРАТЫЎНА-ПРЫКЛАДНОГА МАСТАЦТВА

*Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі*
*па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці*
*1-15 02 01 Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва (па напрамках),*
*напрамку спецыяльнасці 1-15 02 01-07 Дэкаратыўна-прыкладное*
*мастацтва (рэстаўрацыя вырабаў)*

Карэктар В. Б. Кудласевіч
Тэхнічны рэдактар А. У. Гіцкая

Падпісана ў друк 2017. Фармат 60x84 $^1/_{16}$.
Папера офісная. Рызаграфія.
Ум. друк. арк. 1,92. Ул.-выд. арк. 1,47. Тыраж экз. Заказ .

Выдавец і паліграфічнае выкананне:
установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/177 ад 12.02.2014.
ЛП № 02330/456 ад 23.01.2014.
Вул. Рабкораўская, 17, 220007, г. Мінск.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ